# МЕТАДЫ І ПРЫЁМЫ АКТЫВІЗАЦЫІ СЛОЎНІКА ВУЧНЯЎ НА І СТУПЕНІ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ

*Пянькоўская Ганна Вітольдаўна*

УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»

Навучыцца правільна і дакладна выказваць свае думкі ў вуснай і пісьмовай форме, умець пераканаўча, ярка размаўляць і пісаць трэба кожнаму. Таму адной з галоўных задач на сучасным этапе навучання лічыцца развіццё маўлення.

Асновай для дасягнення гэтай мэты служаць урокі літаратурнага чытання і беларускай мовы. Развіваць маўленне вучняў – значыць сістэматычна працаваць над яго зместам, паслядоўна вучыць дзяцей пабудове сказаў, удумліваму выбару неабходнага слова і яго формы, увесь час працаваць над правільным афармленнем думак на пісьме.

Этапы слоўнікавай работы могуць быць наступныя: 1) семантызацыя слова; 2) актуалізацыя слова; 3) выкарыстанне слова ў маўленні.

Актывізацыя слоўніка – адзін з важных накірункаў слоўнікавай работы на ўроках, таму задача настаўніка – дапамагчы вучням авалодаць спалучальнасцю і сферай ужыванні пасіўных слоў, каб перавесці іх у актыўны слоўнікавы запас. Слова лічыцца актывізаваным, калі вучань скарыстаў яго хоць адзін раз у пераказах, апавяданнях, дыялогах, сачыненнях і г. д. Валоданне словам маюцца на ўвазе веданне яго семантыкі, спалучальнасці і сферы ўжывання.

Чым большай колькасцю аналізатараў успрымаецца слова, тым яно больш трывала запамінаецца дзецьмі. Таму трэба кожнае слова правесці праз свядомасць школьніка некалькі разоў і ў розных кантэкстах, каб актыўны ўдзел у засваенні слова прымалі і зрок, і слых, і рука, і памяць, і, вядома, свядомасць.

Для актывізацыі слоўніка работу можна ўявіць у выглядзе наступных асноўных этапаў:

**1. Тлумачэнне слова з дапамогай аднаго ці некалькіх прыёмаў:**

а) тлумачэнне значэння праз кантэкст (Чытанне ўрыўка «высвятляе» значэнне слова; школьнікі лягчэй разумеюць не толькі іх простае значэнне, але і дарэчнасць ужывання, і спалучальнасць, і выразнасць.)

б) падбор сіноніма ці антоніма;

в) падбор звароту, што ўключае ў сябе ўжо вядомае аднакаранёвае слова;

г) высвятленне значэння новага слова па даведкавых матэрыялах, г. зн. па слоўніках і зносках у кнізе для чытання;

д) паказ прадмета, малюнка, макета;

е) словатворны аналіз, на аснове якога высвятляецца значэнне (ці адценне значэння) слова.

ж) параўнанне слоў для высвятлення адрозненняў, для размежавання значэнняў паронімаў.

2. Чытанне і запіс слова (работа над арфаэпіяй і арфаграфіяй).

3. Работа над узорамі ўжывання слова (гатовымі словазлучэннямі і сказамі). Настаўнік знаёміць дзяцей з гатовымі словазлучэннямі і сказамі, што ўключаюць у сябе вывучаныя словы. Некаторыя з іх могуць быць запісаны пад дыктоўку.

4. Работа над семантычнымі сувязямі слова.

Практыкаванні, якія вучаць дзяцей вылучаць і засвойваць сувязі слоў, спрыяюць узбагачэнню іх слоўніка. Такія практыкаванні выпрацоўваюць уменні абіраць патрэбнае слова, дакладна перадаваць сэнс выказвання, разумець адценні значэння, а таксама развіваюць маўленне на аснове аб'ектыўных у лексіцы сувязей паміж словамі.

Былі абраны наступныя накірункі працы па маўленчым развіцці вучняў: праца над развіццём маўленчага апарата; удакладненне і ўзбагачэнне слоўнікавага запасу; фармаванне граматычнага навыку; праца над звязным маўленнем.

Для стварэння эмацыйна-спрыяльнай сітуацыі на ўроках можна выкарыстаць: гульнявыя прыёмы; займальны тэкставы матэрыял; заданні, скіраваныя на развіццё творчага ўяўлення.

1. Праца над развіццём маўленчага апарата складаецца з пастаноўкі правільнага дыхання і развіцця правільнага гукавымаўлення (выразнасці маўлення), чаму спрыяюць чыстагаворкі, скарагаворкі, артыкуляцыйная зарадка. Для дасягнення выразнасці маўлення падыходзяць такія заданні:

– прачытай шэптам, бязгучна, ціха, гучна;

– прачытай з рознай інтанацыяй: радасна, сумна, здзіўлена.

2. Для ўдакладнення і ўзбагачэння слоўнікавага запасу навучэнцаў выкарыстоўваюцца заданні наступнага характару:

– падбор да слова сінонімаў і знаходжанне іх у тэксце, высвятленне падабенства і адрознення ў значэнні;

– падбор да дадзенага слова антонімаў, знаходжанне ў тэксце антанімічных пар і высвятленне іх значэнняў;

– праца над прамым і пераносным значэннем слоў:

– праца з прыказкамі і прымаўкамі;

– праца з фразеалагічнымі зваротамі;

– праца са слоўнікамі;

– выкананне розных відаў творчых прац (складанне сказаў, пераказванне прачытанага з выкарыстаннем ключавых слоў, аповеды па назіраннях, па карцінах, інсцэнаванні невялікіх дыялогаў).

Інтэлектуальныя гульні і заданні:

1) Гульня ў словы: (садавіна, гародніна, дрэвы, мэбля і г. д.)

2) «Азнака»: ( жалеза – жалезны; папера – …; шкло - …)

3) Падбор антонімаў ( мокры – сухі; хадзіць - …)

4) Падбор сінонімаў ( хата – церам – палац; вялікі -…)

5) Падбор прыметнікаў (сабака ( які?) вялікі, кудлаты, вясёлы) 6) «Хто што робіць?» ( узбагачэнне лексічнага запасу дзяцей словамі-дзеяннямі) (настаўнік … ( вучыць); каваль – …)

7) «Параўнай» па смаку – лімон і мёд, па колеры – грушу і сліву, па вышыні – куст і дрэва.

8) «Адгадайка» (загадкі). Як здагадаліся, пра што ідзе гаворка?

9) «Змяншэнне» ( трава – траўка; крэсла – …; тыгр – …)

10) Растлумач значэнне, памяняўшы адну літару (ноч – нос)

11) Назіранне над полісемічнасцю слоў ( каса; ключ;)

3. Фарміраванне граматычных навыкаў правільнага маўлення ўключае: папярэджавнне выкарыстання хібных словазлучэнняў у мове; правільнае ўжыванне слоў у сказах, узгадняючы ў родзе, ліку і склоне; усвядомленая пабудовы сказаў.

Прыёмы работы:

1) Дагаворванне слоў з адпаведнымі канчаткамі ў фразах і рыфмаваннях:

2) «Знайдзі памылку»:

* Узімку ў садзе заквітнелі яблыні.

3) Складанне сказаў па розных мадэлях:

* Хто? Што робіць? Што? (Кот хлебча малако)

4) Развіцце сказаў

* Ярка свеціць сонца. На небе ярка свеціць сонца. На небе ярка свеціць вясновае сонца. На небе ярка свеціць і гуляе вясновае сонца.

5) Змена парадку слоў.

* На парозе сядзеў і жаласна мяўкаў кот.

6) Аднаўленне дэфармаваных сказаў

7) Складанне сказаў па аналогіі:

* Пясок сыплюць, а ваду…

8) Складанне адказу на пытанне:

* Хто лётае? Хто піша вершы?

4. Праца над звязным маўленнем.

Для гэтага трэба вучыць:

– разважаць (прадумваць, аргументаваць, выяўляць дачыненне да выказванага);

– вылучаць галоўнае і другараднае ў аб'екце, параўноўваць, вылучаючы агульнае і markdown рознае;

– будаваць лагічна абгрунтаванае, правільнае ў моўным дачыненні выказванне.

Пры гэтым важнай умовай працы з'яўляецца стварэнне адмысловых камунікатыўных сітуацый, якія вызначаюць матывацыю маўлення, ставяць школьніка перад патрэбай маўленчых выказванняў, узбуджаюць у яго цікавасць і жаданне падзяліцца нечым, расказаць пра нешта. Выказванні дзяцей могуць быць у форме загадкі, аповеда, казкі, успаміну, нязмушанай гутаркі і г. д.

Для ўзбагачэння слоўніка малодшых школьнікаў лексікай чалавечых адносін на ўроках беларускай мовы можна праводзіць хвілінкі дабрыні. Прывядзем прыклады некаторых заданняў:

1.У кожным радку знайдзі аднакаранёвыя словы:

Добры, чуйны, дабрыня.

Далікатны, пяшчотны, пяшчота.

Абыякавасць, абыякавы, неахайны.

З кожным з гэтых слоў складзі сказ.

2. Падбяры аднакаранёвыя словы да словаў павага, вера.

У тлумачальным слоўніку знайдзі значэнні гэтых словаў і запомні.

1) За што можна шанаваць чалавека?

2) Ці кожны чалавек годны павагі?

3. Вызначы, якой часцінай мовы з'яўляецца кожнае слова.

Дакладны, верыць, увага, гасцінны, зычлівы, кпіць, пакрыўдзіць, лагодны, бессардэчнасць, кахаць, сябраваць, абыякавы, павага, трывожыцца, добры, сумленны, праўда, шчыры, жорсткі, гуманны.

Напішы словы ў тры слупкі: назоўнікі, прыметнікі, дзеясловы. Назаві дадатныя якасці чалавека. Як разумець значэнне словаў абыякавы і лагодны?

4. Падбяры прыметнікі, процілеглыя па сэнсе. Запішы. Падкрэслі арфаграмы.

Добры чалавек – злы; сумленны ўчынак – …; гуманнае дачыненне – …; тактоўны вучань – …; люты погляд – …

5. Слоўнікавая дыктоўка.

Запішы ў першы слупок словы, што паказваюць на тое, якімі павінны быць людзі, у другі слупок словы – якімі не павінны быць людзі.

Добрымі, злымі, хлуслівымі, справядлівымі, сумленнымі, стараннымі, спачувальнымі, помслівымі, цярплівымі, праўдзівымі, літасцівымі, гуманнымі, чуйнымі, абыякавымі, жорсткімі.

З кожным словам вусна складзі сказ.

Адбіраючы змест для творчых прац, важна звярнуць увагу на фарміраванне ў малодшых школьнікаў дадатнага дачынення да таварышаў, старых людзей, развіваць уменне скарыстаць у сваіх працах лексіку чалавечых адносін. Можна напісаць сачыненні на наступныя тэмы: «Мая любая матулька», «Мой самы любы чалавек», «Пра майго сябра», «Якія

людзі мне падабаюцца», «Як зрабіць бацькоў шчаслівымі», «Цёплае слова і ў мароз нагрэе» і інш.

Дзеці вельмі любяць гульні са словамі. Так, у 2 класе была праведзена гульня «Магніт». На дошцы былі змешчаны два малюнкі: на адным з іх намалявана лясная паляна, над кветкамі лётаюць матылькі, а на іншым – неба з чорнымі хмарамі, над палянкай ідзе дождж. Адзін малюнак, як магніт, прыцягвае добрыя словы, а іншы – словы з процілеглым значэннем. Так пад малюнкамі з'явіліся карткі са словамі:

добры – злы,
далікатны – грубы,
сяброўства – варожасць,
жорсткі – добры,
спагадны – абыякавы.

У 3 класе прайшоў адкрыты ўрок ветлівасці і дабрыні «Каб радасць людзям дарыць, трэба добрым і ветлівым быць». Дзеці разам з бацькамі аформілі Паляну добрых пажаданняў, дзе на пялёстках кветак выказалі добрыя пажаданні аднакласнікам, бацькам, усім людзям на Зямлі.

Такім чынам, прапанаваная сістэма працы стварае магчымасць узбагачэння маўлення дзяцей лексікай чалавечых адносін, а такім чынам, актывізуе слоўнік малодшых школьнікаў.

Фарміраванне маўленчай дзейнасці – складаны і працяглы працэс, што патрабуе доўгай і крпатлівай працы навучэнцаў і настаўніка.

У сваёй далейшай працы можна паставіць мэты:

– працягваць выкарыстоўаць комплекс заданняў па тэме;

– ствараць на ўроках і пазакласных мерапрыемствах камунікатыўныя сітуацыі, скіраваныя на развіццё маўлення школьнікаў;

– працаваць над развіццём пісьмовых формаў маўлення;

– працягваць праводзіць хвілінкі дабрыні на ўроках беларускай мовы і актыўна скарыстаць практыкаванні і заданні, што змяшчаюць лексіку чалавечых адносін.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Лукашук, М. П. Развіццё мовы вучняў пачатковых класаў / М. П.Лукашук. – Мінск, 1980. – 269 с.

2. Падгайскі, Л. П. Развіццё мовы вучняў пачатковых класаў / Л. П. Падгайскі, Я. М. Івашуціч. – Мінск, 1979. – 329 с.

3. Сторажава, Н. А. Мова твая і мая: Вучу дзяцей па-беларуску / Н. А. Сторажава. – Мінск, 1993. – 184 с.

4. Шанько, А. П. Методыка выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах / А. П. Шанько. – Мінск, 1986. – 408 с.